УДК 94 (476)

***Л. В. Лаўрэенка***
*магістр гіст. навук, настаўнік гісторыі сярэдняй школы в. Скокі*
e-mail: lavreenkol@gmail.com

# СТАЦЫЯНАРНЫ ГАНДАЛЬ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

*На аснове разнастайных крыніц дадзена характарыстыка развіцця стацыянарнага гандлю, вызначана яго роля ў сацыяльна-эканамічным жыцці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Паказана становішча асноўных гандлёвых прадпрыемстваў, якія адносіліся да стацыянарнага гандлю. Прааналізаваны патрабаванні польскіх уладаў да месцаў продажу тавараў і часу гандлю ў іх, паказаны асаблівасці гандлю алкагольнымі напоямі і барацьбы з несумленнай канкурэнцыяй. Адзначаецца, што большасць гандлёвых аб'ектаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі прымітыўнымі. Зроблена выснова, што дзяржаўныя ўлады Польшчы вельмі пільна сачылі за дзейнасцю гандлёвых устаноў.*

## Уводзіны

Актуальнасць тэмы выклікана яе слабай распрацаванасцю ў айчыннай гістарычнай навуцы. Рознічны гандаль, да якога адносіцца стацыянарны гандаль, пакуль не стаў прадметам асобнага вывучэння. Агульныя і разрозненыя звесткі прадстаўлены ў асобных артыкулах [1]. Г. С. Вайцешчык [2] адзначала, што мястэчкі Заходняй Беларусі былі цэнтрамі ўнутранага гандлю і забяспечвалі штодзённыя патрэбы насельніцтва мястэчка і вёскі. Значнымі для вывучэння гісторыі рознічнага гандлю на заходнебеларускіх землях з'яўляюцца працы польскіх даследчыкаў. У кнізе Я. Хадароўскага «Структура ўнутранага таварнага гандлю ў Польшчы» [3] даецца класіфікацыя гандлёвых прадпрыемстваў, выкладзены звесткі аб колькасці гандлёвых прадпрыемстваў па ваяводствах, буйных гарадах, разгледжаны асноўныя галіны ўнутранага гандлю, ахарактарызаваны гандлёвыя прадпрыемствы па тыпу іх арганізацыі. Галоўнай мэтай працы М. Шышкоўскага [4] было высвятленне стасункаў, якія панавалі ў міжваеннай Польшчы ў галіне вулічнага і разноснага гандлю, апісанне яго форм і метадаў. У кнізе прысутнічаюць статыстычныя звесткі аб гандлярах па ваяводствах. Р. Бержанак у сваёй публікацыі [5] разглядаў гісторыю яўрэйскага насельніцтва ва ўсходніх ваяводствах Польскай дзяржавы, яго ўдзел у эканамічным жыцці краю, звяртаў увагу на дамінуючае значэнне яўрэяў у прамысловасці, рамястве і гандлі. Навуковую цікавасць уяўляюць працы аўтараў, што былі сучаснікамі апісаных падзей і мелі доступ да розных крыніц, якія потым былі страчаны. Сярод іх трэба вылучыць працу І. Схіпера «Гісторыя яўрэйскага гандлю на польскіх землях» [6], дзе на аснове шырокага статыстычнага матэрыялу даследаваны стан яўрэйскага рамяства і гандлю ў Польшчы, вызначаны праблемы, якія перашкаджалі іх далейшаму развіццю.

З улікам вышэйадзначанага мэтай артыкула з'яўляецца даследаванне развіцця стацыянарнага гандлю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.

## Стан і праблемы развіцця стацыянарнага гандлю

Стацыянарны гандаль на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў прадстаўлены лаўкамі (крамамі) і магазінамі. Існавалі наступныя віды магазінаў: харчовых і каланіяльных тавараў; харчовых тавараў сумесна з іншымі нехарчовымі (без віна і гарэлкі); мяса, тлушчаў і мясных паўфабрыкатаў; гастранамічныя з продажам на разліў спіртных

Навуковы кіраўнік – А. М. Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна

напояў; крамы віна, гарэлкі і піва; вырабаў тытунёвай манаполіі; крамы мануфактуры, галантарэі і адзення; абутку і вырабаў са скуры; будаўнічых матэрыялаў; мэблі і іншых вырабаў з дрэва; музычных інструментаў і інш. [7, с. 16; 8, арк. 3, 5, 7].

Пераважную большасць складалі харчовыя магазіны – месцы выключна рознічнага продажу розных харчовых тавараў [7, с. 16]. Так, у мястэчку Вязынь Вілейскага павета налічвалася 19 магазінаў, у Даўгінава – 38, Жодзішкі – 4, Крывічы – 22 магазіны і 4 лаўкі, Плісе – 19 магазінаў [9, арк. 7адв.–8; 10, арк. 10–11; 11, арк. 5; 12, арк. 7адв.–8; 13, арк. 246–246адв.]. Усяго ў 1921 г. у Браслаўскай гміне Віленскага ваяводства было 82 магазіны, у Слабадской гміне – 24, Плюскай – 11, Апескай – 18, Відзкай – 33, Рымшанскай – 11, Дукштанскай – 34. У асноўным гэта былі невялікія магазіны мануфактуры, бакалейных, харчовых і гарбарных тавараў [14, арк. 38–39адв.]. Паводле звестак прамысловага аддзела Віленскага ваяводскага ўпраўлення за 1931 г., на тэрыторыі ваяводства налічвалася 304 магазіны харчовых тавараў і 4 магазіны мясных вырабаў [15, арк. 5].

Мяса птушкі, а таксама паўфабрыкаты, прыгатаваныя з мяса жывёлы, забітай рытуальным спосабам, можна было прадаваць выключна ва ўстановах, якія мелі канцэсію на дадзены від гандлю. Гэта значыць, усе бакалеі, харчовыя крамы, сталовыя, рэстараны, у якіх адбываўся продаж мяса птушкі з рытуальнага забою, каўбас і іншых мясных тавараў з пломбамі рытуальнага нажа, павінны былі мець канцэсію на продаж гэтых тавараў [15, арк. 5]. Магазінамі і лаўкамі валодалі пераважна яўрэі, якія і ажыццяўлялі продаж тавараў у крэдыт [16, с. 32].

Асобнае месца займалі магазіны па продажу алкагольных напояў. Напрыклад, у мястэчку Вязынь з 19 магазінаў былі 3 магазіны гарэлкі і віна («Łażyhol», «Wiszyn», «Siedzic»), продаж гэтых тавараў праводзіўся і ў харчовых магазінах [17, арк. 7адв.–8]. Для зніжэння спажывання алкагольных напояў польскія ўлады згодна з законам ад 23 красавіка 1920 г. [18, с. 531–534] уводзілі абмежаванні на продаж напояў з утрыманнем больш за 2,5 % алкаголю, а продаж моцных алкагольных напояў (больш за 45 % алкаголю) быў забаронены. З 1921 г. колькасць месцаў у рознічным гандлі ці ў продажы на разліў абмяжоўвалі да 1 на 2 500 жыхароў [18, с. 532; 19, арк. 97адв.]. З 1922 г. пры адміністрацыйных уладах І і ІІ інстанцый ствараліся камісіі для барацьбы з алкагалізмам, якія вызначалі колькасць і размяшчэнне месцаў рознічнага гандлю (з улікам колькасці насельніцтва павета і інш.) [20, с. 870]. Так, па рашэнні такой камісіі ў Браслаўскім павеце Віленскага ваяводства ў 1923 г. была зменшана колькасць месцаў продажу алкагольных напояў з 26 да 17 [21, арк. 69]. У Пінскім павеце Палескага ваяводства камісія дала дазвол на адкрыццё 33 пунктаў продажу алкагольных напояў, з якіх 23 – магазіны. У 1928 і 1929 гг. у Брэсце дзейнічалі 13 магазінаў алкагольных напояў, у Пінску – 9, а статыстыка па паветах Палескага ваяводства была наступнай: у Брэсцкім павеце працавалі 23 такія магазіны, у Пінскім – 25, Драгічынскім – 18, Косаўскім – 12, Пружанскім – 16, Кобрынскім – 17, Камень-Кашырскім – 12, Сарненскім – 31, Столінскім – 27, Лунінецкім – 19 [22, арк. 3–10адв.; 23, арк. 55–58; 24, арк. 4–6]. У Кобрынскім павеце да 1932 г. колькасць месцаў рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі ўзрасла да 22 магазінаў і 9 рэстаранаў [25, арк. 4].

Да гандлёвых прадпрыемстваў адносіліся таксама сталовыя, рэстараны, кандытарскія, кавярні, малочныя, піўныя, вінныя бары, грамадскія кухні, буфеты, шынкі, карчмы, тракціры, заезныя двары, а таксама вулічныя кухні. Да іх таксама прад'яўляліся вызначаныя патрабаванні: памяшканні павінны былі складацца з двух пакояў – пакою для спажыўцоў і кухні. Гэтыя гандлёвыя ўстановы маглі знаходзіцца на адным або некалькіх паверхах з умовай, што кухня і памяшканне злучаны знутры. Чайныя маглі таксама размяшчацца ў прыватных дамах. Так, напрыклад, жыхарам мястэчкаў Ашмянскага павета – Перавоскаму (Крэва) і А. Аўселчыкаву (Жупраны) – быў дадзены дазвол на адкрыццё чайных у прыватных дамах [26, арк. 43адв.]. У мястэчку Даўгінава

размяшчаўся рэстаран, 4 піўныя, 7 чайных хат, у мястэчку Крывічы – 3 чайныя хаты, кавярня і рэстаран [12, арк. 7адв.–8].

У сталовых павінны былі быць заўсёды гарачыя стравы для спажывання на месцы. Кухні служылі толькі для падрыхтоўкі страў ці прадуктаў. Цэннікі з дакладным указаннем цэн усіх страў і прадуктаў абавязкова трэба было вывешваць на бачным месцы [7, арк. 16–16адв.].

Сярод гандляроў заўсёды існавала вялікая канкурэнцыя, якая яшчэ больш узмацнілася ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. Адсутнасць капіталу, нізкапрацэнтных крэдытаў, беспрацоўе спрыялі скарачэнню гандлю. Цэны на бракаваныя тавары і тавары нізкай якасці, прывезеныя самімі ўладальнікамі ў вазках, скрынях і торбах, былі разлічаны першапачаткова пераважна на бедных кліентаў. З цягам часу яны сталі ствараць значную канкурэнцыю стацыянарнаму гандлю. Аб'яднанні купцоў указвалі на тое, што вулічныя і вандроўныя купцы не выкуплялі патэнт, не аплачвалі падаткі і таму маглі прадаваць свой тавар танней, чым уладальнікі магазінаў. Усё гэта стварала несумленную канкурэнцыю і адбірала ў купцоў значную частку кліентаў. Такія гандляры таксама не неслі адказнасці за рэалізаваны імі тавар, пры выяўленні няякаснага тавару іх немагчыма было прыцягнуць да адказнасці. У 1932 г. страты стацыянарным гандлярам наносілі г. зв. «харчовыя пасылкі», заказаныя па пошце за невялікую плату. Яшчэ адной праблемай былі жабракі, якія адпужвалі кліентаў магазінаў [16, с. 60–61].

У 1926 г. у Польшчы быў прыняты закон «Аб несумленнай канкурэнцыі. Абарона грамадзянскіх правоў прадпрымальнікаў», які рэгуляваў адносіны паміж прадпрымальнікамі. Прадпрымальнікам забаранялася прапаноўваць паслугі і тавары пакупнікам ад імя другога прадпрымальніка. У выпадку парушэння правоў другога прадпрымальніка першы павінен быў кампенсаваць маёмасныя прэтэнзіі [27, с. 1059]. За няправільнае пазначэнне паходжання прадуктаў гандлярам пагражаў штраф да 600 злотых або арышт да 3 дзён. Былі прадугледжаны і яшчэ больш жорсткія меры да парушальнікаў [27, с. 1060]. Паводле распараджэння Міністра ўнутраных спраў Польшчы ад 20 студзеня 1930 г. «Аб афарбоўцы харчовых тавараў» гандлярам забаранялася фарбаваць такія харчовыя тавары, як мяса, рыба, чай, кава, масла, мёд, мясныя і рыбныя вырабы і кансервы. Гарэлка, лікёры, каньяк, віно, ром, мёд для піцця маглі быць афарбаваны толькі карамеллю. Невыкананне палажэнняў дадзенага распараджэння прадугледжвала пакаранне ў выглядзе арышту да 3 гадоў і штрафу да 3000 злотых [16, с. 44].

Найбольш распаўсюджаным прыкладам несумленнай канкурэнцыі быў продаж «для запалу», калі купец выстаўляў тавар на бачным месцы ў выстаўным акне па цане, што была значна ніжэйшай ад яе рэальнай. Зацікаўлены кліент заходзіў у краму і купляў яго, а купец па магчымасці імкнуўся прадаць яму яшчэ які-небудзь тавар, цана якога была значна вышэйшай, чым у канкурэнтаў [16, с. 71].

Час продажу тавараў і адкрыццё магазінаў у будныя дні не павінен быў перавышаць 10 гадзін у суткі. Laткі з мясам, каўбасой і харчовыя крамы (акрамя крам, якія займаліся продажам алкагольных напояў) маглі быць адкрыты да 12 гадзін у суткі ў будныя дні, у суботу і святочныя дні – да 21 гадзіны (з 1 красавіка па 30 верасня) [28, с. 803–804; 29, арк. 2, 30; 31, арк. 6адв]. У будках і кіёсках, у якіх прадаваўся для спажывання толькі на месцы ліманад, мінеральная вада і халодныя напоі, кандытарскія вырабы і садавіна, продаж мог ажыццяўляцца ва ўсе дні тыдня ў перыяд з 1 красавіка па 30 верасня з 9 да 21 гадзіны [28, с. 803]. Згодна з распараджэннем міністра ўнутраных спраў Польшчы ад 9 снежня 1929 г., напярэдадні Каляд і на Вялікдзень магазіны, прадпрыемствы і месцы прафесійнага продажу маглі быць адкрыты звыш 18 гадзін. З 18 да 23 снежня, а таксама ў велікодны тыдзень дазвалялася падаўжэнне часу продажу на 2 гадзіны, аднак не даўжэй за 21 гадзіну [32, с. 1268; 33, арк. 5].

За парушэнне часу продажу і гадзін працы на гандляроў мог быць наложаны штраф да 2 000 злотых і арышт да 6 тыдняў або адно з гэтых пакаранняў. Калі гандляр не мог выплаціць штраф, пакаранне замянялася арыштам не больш за 4 тыдні [32, с. 1268].

Вялікае значэнне ў гандлі мела рэклама, г. зн. усё, што дапамагала ў продажы: не толькі аб'ява ў газеце ці добра афармленая выстава, але і ветлівасць прадаўца. Роля рэкламы складалася ў тым, каб звярнуць увагу на тавар ці магазін, а таксама выклікаць спрыяльнае ўражанне і перакананне, што набытым таварам пакупнік будзе цалкам задаволены. Міністэрства прамысловасці і гандлю Польшчы ўводзіла палажэнні, накіраваныя на рэгуляванне рэкламы, каб інфармацыя адпавядала рэчаіснасці. Распаўсюджваліся лозунгі «Рэклама – гэта мова тавараў», «Рэкламаваць – гэта значыць падахвочваць тавары "да гутаркі", натхняць мёртвыя тавары жывой гаворкай». Рэклама павінна быць дарэчнай, мэтанакіраванай, граматна праведзенай, з тэкстамі, складзенымі спецыялістамі, ілюстрацыямі добрых мастакоў [16, с. 72–73, 78]. Існаваў спецыяльны падатак на шыльды і вітрыны [34, арк. 15].

Магазінамі і лаўкамі валодалі пераважна яўрэі. У 1933 г. у Віленскім ваяводстве сярод гандляроў 36,5 % складалі хрысціяне і 61,9 % – яўрэі; у Беластоцкім – 40,1 і 58,2 % адпаведна; Навагрудскім – 34,8 і 63,9%; Палескім – 31,5 і 66,8 % [16, с. 32, 40]. Паміж купцамі-хрысціянамі і купцамі-яўрэямі нярэдкімі ўзнікалі канфлікты, пераважна эканамічнага характару. Акрамя таго, гандляру-яўрэю, які не мог атрымаць сродкі для існавання іншым шляхам, даводзілася праяўляць асаблівую вынаходлівасць і спрыт. Прапановай тавару нізкай якасці ён мог устанаўліваць цэны, якія прыцягвалі бяднейшае насельніцтва. Менавіта такі гандаль (для бяднейшых пакупнікоў) пераважаў на заходнебеларускіх землях [35, с. 262]. Сітуацыя ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу яшчэ больш пагоршылася. Зменшыліся гандлёвыя абароты і абвастрылася змаганне за кліента. Барацьба паміж гандлярамі-хрысціянамі і гандлярамі-яўрэямі ў некаторых мясцовасцях прымала складаныя формы. Нарастаючая антыяўрэйская хваля дасягнула кульмінацыі ў лістападзе 1937 г., калі адбыўся Агульнапольскі кангрэс гандляроў-хрысціян. Адной з яго мэтаў было паляпшэнне пазіцыі палякаў у гандлі. Заклікалі абмяжоўваць яўрэяў («Гандляр-паляк павінен пры набыцці тавара пазбягаць яўрэйскія крыніцы», «Гандляр-паляк не павінен падтрымліваць таварыскіх адносін з яўрэямі»), выдаляць іх з гандлю («Гандляр-паляк павінен наймаць у персанал толькі палякаў»), байкатаваць тавары яўрэяў. Прад'яўляліся патрабаванні і да польскіх уладаў: «Урадавыя і камерцыйныя ўстановы, органы мясцовага самакіравання павінны былі падтрымліваць гандлёвыя адносіны толькі з гандлярамі-хрысціянамі» [16, с. 39].

У шэрагу мясцовасцей адзначаліся правакацыі – выбухі петардаў і іншых прадметаў каля магазінаў яўрэяў. У перадсвяточны перыяд каля іх дзяжурыла г. зв. «нацыянальная» баявая дружына, якая наладжвала бойкі з кліентамі, якія вырашаліся на пакупкі ў гэтых магазінах. Нярэдкім было збіццё і рабаванне гандляроў-яўрэяў падчас гандлю, знішчэнне і разгром іх латкоў і г. д. Адным з яркіх прыкладаў такой напружанай сітуацыі стаў выпадак, які адбыўся 13 мая 1937 г. у Брэсце ў сувязі з забойствам паліцэйскага падчас канфлікту з яўрэямі, прадаўцамі мяса. З малога рынку беспарадкі перанесліся ў іншыя часткі горада, дзе граміліся вітрыны яўрэйскіх магазінаў. 14 мая 1937 г. польскія ўлады забаранілі ўезд у горад усім асобам, якія не пражывалі тут увесь час. Сітуацыю ўдалося ўрэгуляваць толькі да 20 мая. Матэрыяльны ўрон яўрэйскі бокацаніў у 2 млн злотых, паводле дзяржаўных уладаў – 500 тыс. злотых. Яўрэйская прэса прадставіла падзеі 13 мая 1937 г. як добра прадуманую і арганізаваную спробу поўнага знішчэння яўрэйскага гандлю ў горадзе. Яна выказвала меркаванне, што Брэст павінен быў стаць знакам эфектыўнай расправы з «яўрэйствам» і паслужыць прыкладам для іншых гарадоў у Польшчы [36, с. 11–15].

Большасць магазінаў і лавак на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі прымітыўнымі. Існавала вялікая колькасць малых крамаў (магазінчыкаў), размешчаных у памяшканнях без вокнаў. Аднак да магазінаў прад'яўляліся высокія санітарныя патрабаванні: памяшканні павінны былі быць светлымі, прасторнымі, сухімі і чыстымі; персанал павінен насіць белыя фартухі; харчовыя прадукты (масла, сыр, каўбасныя вырабы і тавары без упакоўкі) павінны размяшчацца ў шкляных вітрынах і быць абароненымі ад рук пакупнікоў [16, с. 43], кандытарскія вырабы – пад шклянымі вітрынамі ці пад каўпакамі на талерках, шкляных, парцалянавых ці металічных падстаўках [37, с. 335–338]. Асобныя патрабаванні былі да месцаў продажу хлеба і кандытарскіх вырабаў: знаходзіцца на адлегласці 3 м ад агульных каналізацыйных пунктаў і на 10 м ад кароўнікаў, хлявоў, сметнікаў і г. д.; сцены памяшканняў павінны быць пабелены і мець светлую двухмятровую пафарбаваную панэль; сталы для продажу, калі не мелі мармуровых або шкляных паверхняў, і паліцы павінны быць з несмалістага, гладкага дрэва, без шчылін і зазораў. Продаж мяса хатняй птушкі, паўфабрыкатаў, выробленых з мяса, атрыманага рытуальным забоем, мог ажыццяўляцца толькі пры наяўнасці адпаведнай канцэсіі [38, арк. 44]. Былі ўстаноўлены адлегласці для размяшчэння месцаў продажу алкагольных напояў: не менш за 50 м ад будынкаў завадскіх майстэрняў (ад 50 да 100 рабочых), не менш за 100 м ад цэркваў, малітоўных дамоў, школ, судоў, турмаў, чыгуначных вакзалаў і станцый, прычалаў паравых судоў, казармаў і заводаў (100 і больш рабочых). У вёсках дадзеная адлегласць складала 300 м.

Сельскія магазіны ў большасці сваёй былі маленькімі, складаліся з аднаго памяшкання і былі падобныя на дробныя лаўкі і нават прылаўкі. Яны не мелі наёмных работнікаў, як правіла, там працаваў толькі адзін чалавек, які з'яўляўся і прадаўцом, і ўладальнікам магазіна. Абароты дадзеных прадпрыемстваў былі малымі і маглі складаць да 22 злотых штодня. Асноўную масу ўладальнікаў сельскіх магазінаў складалі яўрэі. У бедных вёсках, у якіх збожжа хапала толькі для таго, каб пракарміць сям'ю, таваразварот быў зусім нязначны.

Продаж алкагольных напояў быў строга забаронены асобам да 21 года, вучням школ, спажыўцам у крэдыт, пад заклад якіх-небудзь прадметаў ці за адпрацоўку. Таксама забараняўся продаж і ўжыванне алкагольных напояў: у чыгуначных буфетах, на станцыях, у цягніках, на прыпынках паравых судоў і на саміх судах, казармах і ваенных лагерах, крамах і буфетах для вайскоўцаў, на тэрыторыі прамысловых і фабрычных збудаванняў, у памяшканнях і месцах для спартыўных і гімнастычных заняткаў, у сельскіх дамах культуры і памяшканнях пажарнай каманды, ва ўсіх населеных пунктах падчас ваенных збораў ці мабілізацыі, выбараў у заканадаўчыя ці мясцовыя органы ўлады, падчас правядзення асобных судоў і інш. Падчас масавага збору насельніцтва на гандаль, кірмашы, храмавыя святы, паломніцтвы, місіі і г. д. продаж алкагольных напояў праводзіўся толькі ў адпаведныя гадзіны [18, с. 532–533]. На парушальнікаў накладвалі вялікі штраф, які складаў 20 тыс. марак ці арышт да 1 месяца, пры паўторным парушэнні – штраф да 100 тыс. марак ці арышт да 3 месяцаў. У некаторых выпадках адзываліся канцэсіі на продаж алкагольных напояў, пры паўторным парушэнні пазбаўлялі канцэсіі.

Складаная эканамічная сітуацыя, якая панавала на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у поўнай меры адбілася на ўзроўні дабрабыту і культуры яе спажыўцоў. Пераважаў натуральны характар жыцця заходнебеларускага сялянства. Так, наяўнасць слаба развітай сеткі транспартнай камунікацыі, вялікая адлегласць заходнебеларускай вёскі ад галоўных прамысловых і гандлёвых цэнтраў, вялікая цана на некаторыя віды тавараў вымушалі селяніна амаль усе тавары першай неабходнасці (прадметы хатняга ўжытку, посуд, адзежу, абутак, санкі, вазы, сельскагаспадарчы, рамесны інвентар і інш.) вырабляць сваімі сіламі. Асноўнымі харчовымі таварамі, напрыклад, жыхароў в. Чудзін Луні-

нецкага павета з'яўляліся хлеб, бульба, агуркі і капуста. Мяса, малако, а таксама цукар ужываліся ў невялікіх колькасцях. Нярэдкай з'явай на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў менавы гандаль. Яйкі вельмі часта мяняліся ў крамах на соль, фарбу, запалкі і іншыя дробязі [16, с. 198]. На заходнебеларускіх землях у 20–30-я гг. XX ст. больш распаўсюджаным быў разносна-развазны і вулічны гандаль.

А. Хадолы і В. Ястжэмбоўскі адзначалі, што сярод гандлёвых кропак, якія абслугоўвалі большую частку насельніцтва, пераважалі прымітыўныя магазіны і яшчэ больш убогія лаўкі і будкі. Гэта было вынікам і знешняй праявай нізкага ўзроўню жыцця, асабліва сельскага насельніцтва. Нарэшце, дробныя магазіны востра адчувалі сталы нагляд паліцыі за цэнамі, мерамі і вагой. На падставе безумоўнага выканання распараджэнняў адбывалася праследаванне дробных гандляроў, найперш яўрэяў [39, с. 18–19].

Унутраны рынак заходнебеларускіх зямель быў перанасычаны таннымі таварамі нізкай якасці. Гандляры вельмі часта карысталіся нявызначанымі і нават нелегальнымі крыніцамі закупу (напрыклад, з кантрабанды) [40, с. 197]. Вядома, у вялікіх гарадах існавалі магазіны, якія прадавалі дарагія тавары высокай якасці ці асобнымі індывідуальнымі характарыстыкамі, прызначаныя для больш забяспечаных кліентаў.

Пакупная здольнасць насельніцтва была вельмі нізкай, а цэны высокімі. У Навагрудскім ваяводстве ў 1925 г., напрыклад, ялавічына каштавала 1 злоты за 1 кг, бараніна – 90 грошаў за 1 кг, свініна – 1,9 злотага, буракі – 12 грошаў, цыбуля – 24 грошы за 1 кг [41, арк. 17]. У 1925–1926 гг. уладальнікі маслабойняў і сыраварняў, купляючы ў сялян малако, плацілі 10–15 грошаў за літр, у той час калі 1 л малака ў горадзе каштаваў 35 грошаў, сала – 3,5 злотага, 1 кг цукру – 1,4 злотага, 1 кг мыла – 1,7 злотага, 1 кг солі – 35 грошаў [42, с. 359].

У перыяд сусветнага эканамічнага крызісу на тэрыторыі Заходняй Беларусі заработная плата была на 50–65 % ніжэй заработнай платы рабочых карэннай Польшчы. Сярэдні тыднёвы заробак рабочага Варшаўскага ваяводства складаў 42,06 злотага, а Віленскага – 27,67, Палескага – 21,87, Навагрудскага – 15,07 [30, с. 59]. Аднадзённая зарплата рабочых мужчын на фанерных фабрыках у Пінскім павеце Палескага ваяводства ў 1937 г. складала 1,2 злотага, жанчын – 60 грошаў, у той час як 1 кг сітняга хлеба каштаваў 34 грошы, 1 кг пшанічнай мукі – 53 грошы, алей – 3,4 злотага, 1 л газы – 35 грошай [42, с. 359]. У 1932 г. за 1 кг пшанічнай мукі ў Несвіжы плацілі 39 грошаў, Слоніме – 40, Лідзе – 38, Валожыне – 44 [43, арк. 9]. Цэны на малочныя прадукты ў некаторых павятовых гарадах у тым жа годзе прадстаўлены ў табліцы.

Табліца. – Цэны на малочныя прадукты ў 1932 г., злотыя

| Павятовы горад | Малако (за 1 л) | Масла (за 1 кг) | Яйкі (за дзесятак) |
|---|---|---|---|
| Баранавічы | 0,2 | 3,5 | 0,6–0,7 |
| Ліда | 0,2 | 3,15 | 0,6–0,7 |
| Навагрудак | 0,25 | 3,0 | 0,6 |
| Нясвіж | 0,15 | 2,5 | 0,55 |
| Слонім | 0,25 | 3,25 | 0,6–0,7 |
| Стоўбцы | 0,25 | 2,75 | 0,6 |
| Шчучын | 0,2 | 2,5–3,5 | 0,6 |
| Валожын | 0,2 | 2,0 | 0,5 |

*Заўвага – Складзена па: [43, арк. 9].*

Характэрнай асаблівасцю гандлю была пагоня за кожным грошам: нават невялікі заробак мог мець значэнне для ўтрымання шматлікай сям'і гандляра. Таму выкарыстоўваліся ўсе, нават несумленныя, магчымасці заробку. Адной з такіх магчымасцей было павышэнне цэн на тавары, што прызначаліся на продаж. Асабліва востра цэнавая палі-

тыка і спекуляцыя паўсталі ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу. Хутка раслі цэны на шэраг тавараў, а ў некаторых мясцовасцях адчуваўся недахоп многіх з іх. Рознічныя цэны на каву, чай, грэцкія і турэцкія разынкі, міндаль, перац і г. д. залежалі ад тэндэнцый на замежным рынку. Спецыфічным таварам быў рыс, цэны на які ўвесь час раслі, таму гандляры былі слаба зацікаўлены ў яго продажы.

У кастрычніку 1936 г. быў выдадзены ўрадавы цыркуляр пра неабходнасць барацьбы з павышэннем цэн. Забаранялася павелічэнне цэн на прадметы першай неабходнасці без дазволу цэнтральных польскіх улад. Для гэтага была створана камісія па кантролі за цэнамі [4, с. 211–212]. Прозвішчы віноўных у спекуляцыі публікаваліся ў прэсе. На працягу некалькіх дзён вінаватых адпраўлялі ў лагер у Бярозе-Картузскай ці штрафавалі. Так, у 1938 г. за спекуляцыю ў Бярозе-Картузскім лагеры адбывалі пакаранне 40 чалавек. Многія гандляры лічылі, што дадзеныя мерапрыемствы мелі хутчэй палітычныя, чым эканамічныя мэты.

Моцная гандлёвая канкурэнцыя ў 1930-я гг., кантроль з боку польскіх улад за ўзроўнем гандлёвых паслуг абавязвалі гандляроў бесперапынна павышаць кваліфікацыю. За ўсялякія, нават дробязныя, адступленні ад дзеючых палажэнняў накладваўся высокі штраф ці арышт. Караліся такія гандлёвыя парушэнні, як, напрыклад, перавышэнне часу гандлю ці адсутнасць пломбаў на каўбасных вырабах. Гандляр прыцягваўся да адказнасці за адсутнасць цэннікаў на вырабах спіртавой ці тытунёвай манаполіі; адсутнасць акцызнай маркі на піве, правядзенне гандлю з неадпаведным прамысловым пасведчаннем і інш. У законе аб барацьбе з несумленнай канкурэнцыяй быў вызначаны таксама і шэраг парушэнняў з боку вандроўных і вулічных гандляроў.

Спагнанне празмерных цэн купцамі расцэньвалася як ліхвярства. Аднак адносілася яно да вызначаных тавараў, на якія цэны рэгуляваліся адміністрацыяй (напрыклад, соль, цукар, дрожджы). Цэны на ўсе астатнія тавары фарміраваліся самімі купцамі. Але гандляр мог быць прыцягнуты да адказнасці за адсутнасць прэйскуранта тавараў усеагульнага спажывання, адсутнасць цэн, адмову ад выдачы чэка пакупніку, адсутнасць накладных, усталяванне цэн вышэй ад выяўленых на тавары ці цэнніку [16, с. 49–50].

Існавалі г. зв. «каноны» гандлёвага майстэрства, якія ўтрымоўвалі правілы паводзін з кліентамі, а таксама тыя прафесійныя навыкі, якімі павінен валодаць гандляр. Недастаткова было мець якасны тавар у шырокім асартыменце, добры магазін і рэкламу. Неабходна было быць добрым прадаўцом, які павінен клапаціцца пра кожнага кліента. Ад прадаўцоў патрабаваліся адпаведныя асаблівасці характару і разумовыя здольнасці. Суадносныя патрабаванні таксама прад'яўляліся і да знешняга выгляду прадаўцоў, якія павінны былі ўвесь час быць у чыстай вопратцы. «Першым абавязкам добрага прадаўца з'яўляўся клопат пра свой знешні выгляд, пра сваё фізічнае і духоўнае здароўе... каб сваім выглядам не адпужваць пакупнікоў, а іх прыцягваць, утрымаць, пакінуць пра сябе з першай хвіліны добрае ўражанне» [16, с. 63–64].

**Заключэнне**

1. Стацыянарны гандаль на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў прадстаўлены лаўкамі, крамамі і магазінамі. Пераважную большасць складалі харчовыя магазіны (на тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1931 г. іх налічвалася 304). Да стацыянарнага гандлю адносіліся таксама сталовыя, рэстараны, кандытарскія, кавярні, малочныя, піўныя, вінныя бары, грамадскія кухні, буфеты, шынкі, карчмы, тракціры, заезныя двары, а таксама вулічныя кухні. Асобнае месца ў стацыянарным гандлі адводзілася магазінам па продажы алкагольных напояў, якія дзейнічалі ва ўмовах абмежавальных мер з боку польскіх улад.

2. Канцэнтрацыя капіталаў у буйным рознічным (крамным) гандлі была слабая. На заходнебеларускім рынку панаваў дробны прыватны гандаль, які дапаўняўся кааператыўным і канцэсійным. Буйны гандаль не атрымаў развіцця. Шырокае распаўсю-

джанне ў Заходняй Беларусі нестацыянарнага гандлю (вулічнага і вандроўнага) абумоўлівалася спецыфікай рынку. Пашыранасць развазнога гандлю выклікалася «распыленасцю» паселішчаў, а на Палессі – і цяжкадаступнасцю да іх, адсутнасцю шляхоў зносін. Большасць магазінаў і лавак былі прымітыўнымі. Існавала вялікая колькасць малых крам (магазінчыкаў).

3. Польскія ўлады ўлады ажыццяўлялі кантроль за гандлем. У выпадку парушэнняў заканадаўства аб нядобрасумленнай канкурэнцыі ў сферы гандлі да парушальнікаў прымяняліся штрафныя санкцыі і нават турэмнае зняволенне. Да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ці арышту прыцягвалі за парушэнне палажэнняў закона і распараджэнняў аб продажы алкагольных напояў. Да гандлю прад’яўляліся неабходныя санітарныя патрабаванні.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Шепетюк, В. В. Участие еврейского населения в формировании и функционировании торговых отношений на территории Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / В. В. Шепетюк // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. : у 2 ч. – Брэст, 1998. – Ч. 2. – С. 162–167.
2. Вайцешчык, Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Г. С. Вайцешчык. – Гродна, 2013. – 143 арк.
3. Chodorowski, J. Struktura wewnętrznego handlu towarowego w Polsce / J. Chodorowski. – Warszawa : Nakł. Izby Przemysłowo-Handlowej w Warszawie, 1938. – 151 s.
4. Szyszkowski, M. Handel domokrążny i uliczny / M. Szyszkowski. – Warszawa, 1937. – 43 s.
5. Bierzanek, R. Ludność żydowska na Ziemiach Wschodnich / R. Bierzanek // Rocznik Ziem Wschodnich. – Warszawa, 1939. – S. 63–72.
6. Schiper, I. Dzieje handlu żydowskiego na ziemiach Polskich / I. Schiper. – Warszawa, 1937. – 792 s.
7. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). – F. 51. Ap. 4. B. 127.
8. LCVA. – F. 338. Ap. 3. B. 210.
9. Занальны дзяржаўны архіў у Маладзечна (ЗДАМ). – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 372.
10. ЗДАМ. – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 378.
11. ЗДАМ. – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 393.
12. ЗДАМ. – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 474.
13. ЗДАМ. – Ф. 437. Воп. 1. Спр. 1402.
14. ЗДАМ. – Ф. 436. Воп. 1. Спр. 339.
15. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 383.
16. Korycki, G. Etyka kupiecka i handel przywatny w Drugiej Rzeczypospolitej / G. Korycki. – Warszawa, 1993. – 131 s.
17. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 760.
18. Ustawa z dnia 23 kwietnia 1920 r. o ograniczeniach w sprzedaży napojów alkoholowych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1920. – № 37. – Poz. 210. – S. 531–534.
19. ЗДАМ. – Ф. 436. Воп. 1. Спр. 4.
20. Rozporządzenie wykonawcze Ministra Zdrowia Publicznego z dnia 2 czerwca 1922 r. w porozumieniu z Ministrem Spraw Wewnętrznych i Ministrem Skarbu do ustawy z dnia 23 kwietnia 1920 roku o ograniczeniach w sprzedąży i spożyciu napojów alkoholowych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1922. – № 51. – Poz. 462. – S. 870–871.
21. ЗДАМ. – Ф. 436. Воп. 1. Спр. 457.
22. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 679.

23. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1596.
24. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1597.
25. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 813.
26. ЗДАМ. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 139.
27. Ustawa z dnia 2 sierpnia 1926 r. o zwalczaniu nieuczciwej konkurencji. Ochrona cywilno-prawna praw przedsiębiorcy // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1926. – № 96. – Poz. 559. – S. 1059.
28. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 22 marca 1928 r. o godzinach handlu i godzinach otwarcia zakładów handlowych i niektórych przemysłowych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1928. – № 38. – Poz. 364. – S. 803–804.
29. LCVA. – F. 145. Ap. 1. B. 479.
30. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса. 1929–1933 гг. / И. В. Полуян. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.
31. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 276.
32. Rozporządzenie Ministra Spraw Wewnętrznych z dnia 9 grudnia 1929 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Pracy i Opieki Społecznej i Ministrem Przemysłu i Handlu o przedłużeniu godzin handlu przed wigilją Bożego Narodzenia i przed Wielką Sobotą // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1929. – № 85. – Poz. 633. – S. 1268.
33. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 57. Воп. 1. Спр. 95.
34. ДАБр. – Ф. 2005. Воп. 1. Спр. 667.
35. Landau, Z. Gospodarka Polski międzywojennej 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1967–1989. – T. II : Od Grabskiego do Pilsudskiego. Okres kryzysu koniunktury. 1924–1929. – 1971. – 359 s.
36. Śleszyński, W. Zajścia antyżydowskie w Brześciu nad Bugiem 13. V. 1937 / W. Śleszyński. – Bialystok, 2004. – 139 s.
37. Rozporządzenie Ministra Opieki Społecznej z dnia 18 lutego 1937 r. wydane w porozumieniu z Ministrem przemysłu i handlu o dozorze nad wyrobem i obiegiem mąki i wyrobów mącznych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1937. – № 25. – Poz. 171. – S. 335–338.
38. LCVA. – F. 55. Ap. 4. B. 425.
39. Hodoly, A. Handel wiejski w Polsce międzywojennej. Liczby i fakty / A. Hodoly, W. Jastrzębowski. – Warszawa : PWG, 1957. – 263 s.
40. Landau, Z. Gospodarka Polski międzywojennej 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa : Książka i wiedza, 1967–1989. – T. I : W dobie inflacji. 1918–1923. – 1967. – 399 s.
41. ДАГр. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2234.
42. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. –613 с.
43. ДАГр. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2236.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 09.03.2020

***Laureyenka L. V.*** **Stationary Trade on the Territory of Western Belarus in 1921–1939**

*The article deals with the development of stationary trade and its role in the economic life of Western Belarus in 1921–1939. On the basis of various sources, the main commercial enterprises related to stationary trade are characterized. The requirements of the Polish authorities to the places of sale of goods and the time of trade in them are considered by the peculiarities of the trade in alcoholic beverages and the fight against unfair competition are characterized. It is noted that most of the shops and benches in Western Belarus were primitive. It is concluded that the state authorities closely monitored the activities of trade institutions.*